PolotskSU



УДК 398+ 930.25

# РОЛЯ ЗБІРАЛЬНІКА Ў ФАРМІРАВАННІ ФАЛЬКЛОРНАГА АРХІВА

*канд. філал. навук Я.І. ГРЫНЕВІЧ*
Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, Мінск

*Статья посвящена роли собирателя в формировании фольклорного архива (на примере фольклорного архива Института искусствоведения, этнографии и фольклора имени К. Крапивы – Коллекции фольклорных записей). Показано, что несмотря на идеологию и ограничения разных исторических периодов, социальные ожидания, техническое оснащение, стратегии собирания и темы научно-исследовательских работ, именно личность собирателя, его персональные интересы и подходы играют ключевую роль в формировании фольклорных архивов.Выявлено, что материалы, собранные профессиональными исследователями, студентами и любителями отличаются методами, содержанием и качеством записей. Материалы исследователей не требуют проверки, а звуковые файлы характеризуются высоким качеством, что позволяет использовать их не только в академической сфере, но и для популяризации. Разнообразные материалы краеведов-любителей требуют дополнительных комментариев, систематизации и определения их места в структуре фольклорного архива. Фольклорно-этнографическим данным, собранным любителями и студентами, необходима верификация и дополнительная обработка из-за невысокого качества.При этом все эти типы сборовотражают специфику фольклораопределённой местности, дополняют друг друга и, тем самым, дают больше материала для анализа.*

Важнасць фальклорных архіваў, якія з’яўляюцца сховішчамі, рэпазіторыямі для фальклорных твораў і служаць месцамі не толькі захавання, але і пастаяннай дступнасці дыскрэтных уяўленняў гэтага канкрэтнага класса творчых паводзін чалавека [1, с. 5], ніколі не ставілася пад сумнеў. Станаўленне фальклорных архіваў напрамую звязана з развіццём фалькларыстыкі як самастойнай навукі.

Пачатак збірання беларускага фальклору адносіцца да канца XVIII – пачатку XIX ст. і звязаны з імёнамі Зарыяна Даленгі-Хадакоўскага, Марыі Чарноцкай, Яна Чачота, Аляксандра Рыпінскага, Канстанціна і ЯўстахаТышкевічаў, Рамуальда Зянькевіча і іншых.

Уздым збіральніцкай і даследчыцкай актыўнасці ў 20-ых гадах ХХ ст. звязаны з пачаткам працы Навукова-тэрміналагічнай камісіі пры Народным камісарыяце асветы ў 1921 г., а таксама з утварэннем Інстытута беларускай культуры ў 1922 г., пры якім з 1924 г. існавала Цэнтральнае бюро краязнаўства. Важную ролю ў збіральніцкай дзейнасці ў гэты перыяд адыгралі таксама краязнаўчыя арганізацыі, утвораныя на тэрыторыі Беларусі. Цікавасць да збору фальклору была падтрымана СМІ: заклікі да збору фальклору з'явіліся ў папулярных беларускіх газетах і часопісах. Карэспандэнты дасылалі матэрыялы, якія характарызуюць мясцовую культуру ў навукова-даследчыя інстытуты і краязнаўчыя арганізацыі, на конкурсы збіральнікаў фальклору.

У 1929 годзе на базе Інстытута беларускай культуры была створана Акадэмія навук. У Інстытуце гісторыі пачаў працу сектар этнаграфіі і фальклору, які стаў цэнтрам для збору

PolotskSU



і вывучэння народнай творчасці. У 1957 г. на базе названагасектара быў утвораны Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклоруАН БССР (ІМЭФ). Стварэнне Інстытута стала важным крокам на шляху да каардынацыі навуковых даследаванняў беларускай культуры. Раней групы вучоных у розных установах Акадэміі навук вывучалі шматлікія аспекты беларускай культуры.

Уканцы 1950-х гг. пачаў фарміравацца і архіў новастворанага Інстытута. Фонд фальклорных матэрыялаў быў вылучаны ў самастойную адзінку – Калекцыю фальклорных запісаў, якая Пастановай Савета Міністраў Беларусі ад 2 жніўня 2001 г. атрымала статус нацыянальнага навуковага здабытку (Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 2 жніўня 2001 г. № 1137; дзяржаўны рэестравы нумар 3).Сёння Калекцыя фальклорных запісаў існуе пры аддзеле фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў, што належыць да Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі.

Калекцыя фальклорных запісаў налічвае больш за 400 тысяч тэкставых і 70 тысяч гукавых запісаў фальклору, сярод якіх асноўную частку складае вусная народная творчасць беларусаў. Таксама ў архіве прадстаўлены рускі, польскі, украінскі, яўрэйскі, літоўскі і цыганскі фальклор. Найстарэйшыя фальклорныя рукапісы датуюцца 1910–1912 гг. (запісы яўрэйскага фальклору, зробленыя Якавам Шэйнінам у Віцебску).

Матэрыялы, што захоўваюцца ў Калекцыі фальклорных запісаў, ўлучаюць *рукапісныя тэксты, гуказапісы* і *іх тэкставыя* і *нотныя расшыфроўкі,*а таксама *фотаздымкі* і *відэазапісы*. Яны паступаюць у архіў з розных крыніц. Асноўная частка дадзеных была сабрана у час палявых экспедыцый супрацоўнікаў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фалькларыстыкі імя К. Крапівы.Акрамя таго, у архіве знаходзяцца запісы фальклорных твораў, што былі адпраўлены на конкурс «Лепшы збіральнік фальклору». Астатняя частка – матэрыялы, перададзеныя з прыватных збораў і ўніверсітэцкіх архіваў (Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.Куляшова, Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы, Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка). Калекцыя пастаянна папаўняецца новымі фальклорна-этнаграфічнымі матэрыяламі.

У працэсе фіксацыі фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў на збіральнікаў уплывалі *гістарычныя ўмовы.* У залежнасці ад канкрэтных палітычных ідэалогій і абмежаванняў розных перыядаў пэўным ведам надавалася каштоўнасць, іншыя ж наадварот выпадалі з-пад увагі даследчыкаў. Пад уплывам рамантызму збіранне фальклору ўспрымалася як «патрыятычны абавязак у эпоху нацыянальнага будаўніцтва» [2, с. 46]. У савецкі час, згодна з тагачаснымі ідэалагічнымі ўстаноўкамі, у фокусе ўвагіапынуўся “новы”, “сучасны” фальклор (калгасныя і рабочыя песні, песні пра прыгнёт і паншчыну, прыпеўкі, фальклор Вялікай Айчыннай вайны і інш.). Пры гэтым некаторыя жанры свядома ігнараваліся збіральнікамі. Так адбылося, напрыклад, з духоўнымі вершамі, замовамі, а таксама з фальклорам антысавецкай скіраванасці.

Істотны ўплыў на папаўненне архіва аказала падрыхтоўка да выдання шматтомнага зводу “Беларуская народная творчасць”, прысвечанаму ўсім жанрам і відам беларускага фальклору. З гэтай мэтай у кожную вобласць БССР былі арганізаваны комплексныя палявыя экспедыцыі. У 1969 г. была абследавана Брэсцкая вобласць; у 1970 г. – Гродзенская вобласць; ў 1971 г. – Віцебская вобласць; у 1972 г. – Мінская вобласць; у 1973 годзе – Магілёўская вобласць. Адбылося некалькі экспедыцый ва ўсе раёны Гомельскай вобласці ў 1960–1969 гг.

PolotskSU



і ў 1972–1984 гг. Такім чынам, у перыяд 1960–80 гг. была сабрана велізарная колькасць фальклорных твораў. Першы том "Песні савецкага часу" [3] пабачыў свет у 1970 г. У 1986 г. звод быў адзначаны Дзяржаўнай прэміяй БССР, яго выданне працягваецца і сёння.

Пачынаючы з 1990-х гадоў сітуацыя змянілася: збіральнікі атрымалі магчымасць запісваць ўсе, што яны лічылі каштоўным. Аднак навату постсавецкі час самацэнзура і некаторыя негалосныя ідэалагічныя абмежаванні ўсё ж працягваюць існаваць. Найперш яны звязаны з палітычным і інтэрнэт-фальклорам. Акрамя таго, у гэты перыяд калгасны і рабочы фальклор, партызанскія песні і некаторыя іншыя жанры застаюцца без належнай увагі збіральнікаў.

З моманту стварэння Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору асноўнымі *кірункамі навукова-даследчых работ* былі: вывучэнне генезісу, сістэмы вобразаў і паэтыкі беларускага фальклору. У авангардзе фалькларыстычных даследаванняў апынулася параўнальнае вывучэнне вуснанароднай творчасці славянскіх народаў. Значная ўвага была ўдзелена вывучэнню гісторыі беларускай фалькларыстыкі, фальклорна-літаратурным ўзаемасувязям і ўзаемадзеянню.

У постсавецкі перыяд, нягледзячы на змену парадыгм і падыходаў, значнае пашырэнне сфер даследчыцкай цікавасці, абазначаныя "класічныя" тэмы працягваюць заставацца аднымі з прыярытэтных напрамкаў навуковых росшукаў. Акрамя таго, даследчыкі абіраюць тэмы, да якіх існуе павышаная *грамадская цікавасць*.

Запіс фальклорных твораў напрамую залежыць ад *тэхнічнага абсталявання.* У адпаведнасці з развіццём тэхналогій змяняюцца і магчымасці для фіксацыі фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў. У Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору запіс на магнітныя стужкі пачаўся ў 1960 г. Спецыяльныя бабінныя магнітафоны, мікрафоны і стужкі дазвалялі зрабіць якасны запіс. Аднак, асноўная праблема складалася ў абмежаванай колькасці бабін, якія выдаваліся на адну экспедыцыю. З 1974 г. для запісу пачаў выкарыстоўвацца касетны магнітафон. Аднак, якасць касет, выпушчаных у розны час, істотна адрознівалася. Акрамя таго, пры адсутнасці чыстых касет, выкарыстоўваліся касеты са студыйнымі запісамі, якія выдаляліся, і фальклорныя творы запісваліся наверх, што наўпрост зніжала якасць. У такіх ўмовах індывідуальныя мэты і падыходы збіральнікаў аказвалі непасрэдны ўплыў на выбар тых фальклорных матэрыялаў, якія запісваліся ў поўнай версіі.

Сярод збіральнікаў фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў можна вылучыць тры асноўныя групы: *прафесійныя даследчыкі, краязнаўцы-аматары* і *студэнты*.

Прафесійныя даследчыкі планавалі і праводзілі запіс, а таксама захоўвалі фальклорныя матэрыялы ў адпаведнасці з устаноўленымі мэтамі і стандартамі збору і доўгатэрміновага захавання фальклорнай спадчыны.

Палявыя экспедыцыі ў ІМЭФ распачаліся ў 1960-м годзе і працягваюцца па сённяшні дзень. 1970–1980-ыя гады былі перыядам найбольш інтэнсіўных (як правіла, комплексных) палявых работ. Асноўныя колькасць фальклорных матэрыялаў была сабрана ў савецкія гады такімі даследчыкамі, як Міхаіл Грынблат, Арсень Ліс, Анатоль Фядосік, Канстанцін Кабашнікаў, Васіль Скідан, Галіна Барташэвіч, Ларыса Барабанава, Антон Гурскі, Лія Салавей, Леанілай Малаш, Уладзімір Сысоў, Таццяна Цяпкова, Іван Крук і г.д. У 1990-х гадах збіральніцкая праца была працягнута Уладзімірам Васілевічам, Таццянай Валодзінай, Аленай Боганевай, Ірынай Васільевай, Ірынай Смірновай і інш.

Падчас фальклорна-этнаграфічных экспедыцый прафесійныя даследчыкі абапіраюцца на спецыяльныя апытальнікі або інструкцыі. Спецыялісты спярша даюць

PolotskSU



агульную карціну: якія фальклорныя жанры бытуюцьу дадзенай мясцовасці, а затым, як правіла, засяроджваюцца на тэме сваіх навуковых даследаванняў альбо на самых таленавітых інфарматарах. Інфарматары ўспрымаюць прафесійных збіральнікаў як “чужых”, якім імкнуцца паказаць самае лепшае. Нярэдка яны саромеюцца выконваць творы некаторых фальклорных жанраў (напрыклад, «брахлівыя» песні і прыпеўкі альбо спяваюць такія песні з заменай слоў) з-за іх спецыфікі. Кола тэм, па якіх збіраюць інфармацыю даследчыкі, значна шырэй чым у аматараў і студэнтаў.

Наяўнасць прафесійнага тэхнічнага абсталявання забяспечвае высокую якасць запісу. Аднак недахоп чыстых носьбітаў (бабін, касет) прыводзіў да таго, што даследчыкі мусілі выбіраць, якім чынам і якія творы запісваліся ў поўным выглядзе. Звычайнай практыкай у 1960–1990 гадах быў запіс твораў празаічных жанраў (казак, легенд і г.д.) з паскарэннем. Пры фіксацыі песень прымянялі іншае рашэнне – запісвалі толькі частку твора, як правіла, першую страфу. Увага канцэнтравалася на напеве альбо тэксце, а не на асобе інфарманта. Запісы 1970–1980 гадоў нярэдка характарызуюцца няпоўнай пашпартызацыяй: прысутнічаюць толькі асабістыя дадзеныя тых інфармарматаў, ад якіх была запісана найбольшая колькасць твораў. Акрамя таго, вынікам эканоміі месца стала амаль поўная адсутнасць кантэксту. Даследчыкі запісвалі толькі самі творы, а размова з інфармантам апісвалася ў палявых дзённіках і сёння не можа быць узноўлена ў дэталях.

Пачынаючы з 1990-х гадоў змяніўся падыход да арганізацыі палявых работ. Даследчыкі пачалі практыкаваць кароткатэрміновыя індывідуальныя выезды, замест комплексных экспедыцый.

У сучасных умовах, калі фіксацыя размоў з інфармантамі адбываецца пры дапамозе лічбавых дыктафонаў, фота- і відэакамер, даследчыкі атрымалі магчымасць запісваць размову з інфармантам без абмежаванняў.

Цікавасць да збірання і захавання фальклорнай спадчыны здаўна праяўляюць аматары, як правіла, мясцовыя краязнаўцы, якія не маюць спецыяльнай адукацыі. Збіраючы фальклор, яны найперш засяроджваюцца на тым, што лічаць “народным”, “даўнім”, а значыць каштоўным, вартым захавання і перадачы нашчадкам. Пры гэтым аматары некарыстаюцца спецыяльнымі апытальнікамі або інструкцыямі па збіранні. Як мясцовыя жыхары, аматары маюць магчымасць задакументаваць фальклор “знутры”, у натуральных умовах: у штодзённым бытаванні, падчас каляндарных і сямейных святаў. У той час калі даследчык з’яўляецца “чужым” для мясцовай супольнасці, аматар мае магчымасць дакументаваць фальклорныя творы без абмежаванняў.

Увага аматараў факусіруецца на творах, што пацвярджаецца практыкай перапявання па памяці песень, пачутых у дзяцінстве альбо страчаных. Для іх важна захаваць кожны пачуты тэкст і напеў. У цэлым, прыватныя зборы характарызуюцца невысокай якасцю запісаў з-за адсутнасці прафесійнага тэхнічнага абсталявання.

Матэрыялы, сабраныя аматарамі, заўсёды суправаджаюцца каментарамі збіральніка, у якіх падкрэсліваюцца важныя аспекты бытавання канкрэтных твораў. Шмат увагі ўдзяляецца гісторыі канкрэтнай мясцовасці. Запісы аматараў у адрозненне ад прафесійных даследчыкаў не абмяжоўваюцца палявымі дзённікамі, аўдыё- і відэазапісамі, фотаздымкамі. Іх матэрыялы могуць улучаць спісы жыхароў вёскі, генеалагічныя дрэвы, замалёўкі, інфармацыю пра канкрэтныя мясціны альбо людзей з інтэрнэта, гербарыі і інш.

PolotskSU



Адрознай рысай такіх прыватных збораў з’яўляецца адсутнасць інфармацыі пра самога збіральніка і яго матывацыю. Як правіла, аматары лічаць гэтыя звесткі неістотнымі. Прыватныя калекцыя такога тыпу ставяць перад даследчыкамі і архівістамі шэраг пытанняў пра тое, як уключыць гэтыя дадзеныя ў структуру фальклорнага архіва.

Акрамя даследчыкаў і аматараў, збіраннем фальклору займаюцца студэнты. Складовай часткай Калекцыі фальклорных запісаў з’яўляюцца студэнцкія зборы.Іх фальклорныя матэрыялы былі сабраны ў 1960–2009 гг. студэнтамі філалагічнага факультэта ў рамках фальклорнай практыкі ў Беларускім дзяржаўным педагагічным, Гродненскім і Магілёўскім дзяржаўных універсітэтах. Нягледзячы на адпаведную адукацыю і выкарыстанне спецыяльных апытальнікаў якасць гэтых матэрыялаў была пастаўлена пад сумнеў. Гэтыя калекцыі разглядаліся толькі як вынік студэнцкай практыкі, а не каштоўныя крыніцы для вывучэння традыцыйнай культуры беларусаў.

Матэрыялы, сабраныя студэнтамі ўлучаюць аўдыё запісы, дзённікі палявых работ, карткі і сшыткі з тэкстамі. Студэнцкія гуказапісы вызначаюцца нізкай якасцю, паколькі для дакументавання фальклору яны, як правіла, выкарыстоўваюць уласныя тэхнічныя сродкі (магнітафоны і дыктафоны, мабільныя тэлефоны) з-за незабяспечанасці ўніверсітэтаў абсталяваннем. Пад уплывам прафесійных даследчыкаў, якія кіравалі фальклорнай практыкай, у 1970–1980 гадах студэнты засвоілі прыём павелічэння хуткасці пры запісе народнай прозы. Пры ўсіх недахопах студэнцкіх матэрыялаў, яны былі алічбаваны і сістэматызаваны, аднак для ўвядзення ў навуковы зварот неабходна іх верыфікацыя.

Заключэнне. Нягледзячы на шматлікія фактары, што ўплываюць на фарміраванне фальклорных архіваў, менавіта індывідуальныя мэты і падыходы асобных збіральнікаў аказваюць істотны ўплыўна змест і форму сабраных матэрыялаў. Асоба, узровень адукацыі і ўзрост збіральніка аказаюць непасрэдны ўплыў на працэс збору матэрыялаў і, адпаведна, на дадзеныя, атрыманыя ў выніку.

Фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы, сабраныя прафесійнымі даследчыкамі, студэнтамі і аматарамі адрозніваюцца паводле зместу, метадаў, якасці і ставяць новыя пытанні перад архівістамі.

Матэрыялы, сабраныя прафесійнымі даследчыкамі не патрабуюць праверкі, а гукавыя запісы вызначаюцца высокай якасцю, што дазваляе выкарыстоўваць іх не толькі для даследаванняў, але і для папулярызацыі (на грамадскіх мерапрыемствах, у сродках масавай інфармацыі і г.д.). Запісы, зробленыя спецыялістамі, у цэлым характарызуюць фальклор пэўнай мясцовасці, пасля чаго факусіруюцца на тэматыцы уласных навуковых даследаванняў. Цікавасць даследчыкаў засяроджваецца, у асноўным, на фальклорных адзінках, а не на гісторыі той ці іншай мясцовасці. Значная ўвага ўдзяляецца таленавітым інфарматарам, да якіх вяртаюцца не раз. Асноўны недахоп запісаў прафесійных даследчыкаў у тым, што нярэдка фальклорныя адзінкі выпадаюць з кантэксту бытавання.

Матэрыялы краязнаўцаў-аматараў адлюстроўваюць тое, што яны лічаць “старажытным”, а значыць каштоўным, вартым захавання і перадачы будучым пакалення. Аматары не выкарыстоўваюць апытальнікі і інструкцыі па збіранні, а запісваюць усё, што лічаць цікавым. Такім чынам, гэтыя матэрыялы патрабуюць структуравання, сістэматызацыі, дадатковай размовы са збіральнікам і апрацоўкі з-за невысокай якасці аўдыёзапісаў. Значная частка матэрыялаў патрабуе верыфікацыі і вызначэння іх месца ў структуры фальклорнага архіва.

PolotskSU



Нягледзячы на адпаведную адукацыю студэнтаў і выкарыстанне спецыяльных апытальнікаў, якасць сабраных імі ў межах фальклорна-этнаграфічнай практыкі матэрыялаў была пастаўлена пад сумнеў. Гэтыя зборы разглядаліся толькі як вынік студэнцкай практыкі, а не каштоўныя крыніцы для вывучэння традыцыйнай культуры Беларусі. Для ўвядзення ў навуковы ўжытак яны патрабуюць верыфікацыі.

Фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы, сабраныя прафесіянальнымі даследчыкамі, краязнаўцамі-аматарамі і студэнтамі дапаўняюць адзін аднаго і даюць больш дадзеных для аналізу.

У рэчышчы рэалізацыі асноўных задач, якія сёння стаяць перад фальклорнымі архівамі, перад збіральнікамі стаіць адказная задача па паўнавартаснаму збору і захаванню матэрыялаў, у тым ліку "далікатных" альбо непрымальных на дадзеным этапе з-за тых ці іншых прычын, паколькі архівы павінны ўлічваць інтарэсы і патрэбы карыстальнікаў не толькі на момант запісу, але і ў будучыні.

ЛІТАРАТУРА


1. Kolovos, A. Archiving culture: American folklore archives in theory and practice [Электронны рэсурс] / A. Kolovos // Indiana university. – Рэжым доступу: https://scholarworks.iu.edu/dspace/bitstream/handle/2022/9696/Kolovos_indiana_0093A_10919.pdf;sequence=1. – Дата доступу: 12.02.2018.
2. Bula, D. Disciplinary Past and Shifting geographies of knowledge: addressing the interwar period of Latvian folklorists/ D. Bula // Mapping the History of Folklore Studies: Centres, Borderlands and Shared Spaces / ed. D. Bula, S. Laime. – Cambridge Scholars Publishing, 2017. – P. 43–60.
3. Песні савецкага часу / пад рэд. К.П. Кабашнікава. – Мінск : Навука і тэхніка, 1970. – 576 с.


THE ROLE OF COLLECTORS IN THE FORMATION OF FOLKLORE ARCHIVE

*Y. HRYNEVICH*

*The article is devoted to the role of collector in forming of folklore archives (on the example of the archive of The Institute of Art, Ethnography and Folklore named after K. Krapiva – The Collection of Folklore Records). Despite the ideology, social expectations, technical equipment, collection strategies and research topics, the collector plays a key role in formingfolklore archives. Data collected by researchers, students and amateurs differ in methods, content and quality.Materials collected by researchers do not require verification;sound recordsare characterized by high quality, which makes it possible to use them not only for research, but also for popularization. Data documented byamateurs require additional comments, systematization and determining their place in the structure of archive. Amateurs and students' materials require verification and processing due to the low quality of records. These different types of collectionscomplement each other and, thus, give more material for analysis.*